Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 ЛЮТАГА 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 35 (26148)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ПлацдАрм

# ЧАС ТЭРМІНОВАЙ СЛУЖБЫ БУДЗЕ СКАРОЧАНЫ

**Учора, напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны, міністр абароны Беларусі генерал-палкоўнік Леанід Мальцаў сустрэўся ў Нацыянальным прэс-цэнтры з беларускімі журналістамі.**

— Задача любой дзяржавы — знаходзіць крыніцы небяспекі і не дазваляць, каб яны перараслі ў рэальную ваенную пагрозу. Узброеныя Сілы Беларусі падтрымліваюць мір, стабільнасць і бяспеку, і перш за ўсё яны не інструмент вядзення вайны, а найважнейшы сродак яе прадухілення, — падкрэсліў міністр. — Нас часта абвінавачваюць у занадта вялікай мілітарызацыі. Аднак аб якой мілітарызацыі можа ісці гаворка, калі на ўзбраенне ў 2007-м у нас было выдзелена 1,33 працэнта ад ВУП, а стандарт НАТА — 2 працэнты.

Кіраўнік ваеннага ведамства заўважыў, што Узброеныя Сілы Беларусі былі паспяхова рэфармаваныя, а цяпер адбываецца іх удасканаленне, прычым гэта бесперапынны працэс. З 2002 года ў беларускай арміі прыняты на ўзбраенне 47 узораў узбраення і ваеннай тэхнікі. «Мы не плануем значна павялічваць колькасць тэхнікі, а імкнёмся палепшыць яе эфектыўнасць», — кажа міністр абароны.

Леанід Мальцаў адказаў на ўсе пытанні прадстаўнікоў СМІ. У прыватнасці, нават пра памер сваёй месячнай зарплаты — Br3 млн 700 тысяч у месяц, з якіх 1 200 тысяч складае аклад, 603 тысячы — надбаўка за выслугу, выплата за воінскае званне — 300 тысяч. Ён таксама агучыў грашовае забеспячэнне ваеннаслужачага кантрактнай службы начальніка склада (Br654 тысячы) і кантрактніка-вадзіцеля (Br476 тысяч).

Міністр абароны выказаў думку, што ЗША, знішчыўшы нядаўна разведвальны спадарожнік Зямлі, праверылі пэўны від узбраення. «Любы ваенны выкарыстаў бы такую магчымасць, — перакананы Леанід Сямёнавіч. — У пачатку сакавіка абломкі пачнуць уваходзіць у слаі атмасферы, і можна будзе дакладна даведацца, куды яны ўпадуць. У Беларусі ёсць сродкі для ліквідацыі пазаштатных і надзвычайных сітуацый, а значыць, мы б знайшлі магчымасць для ліквідацыі наступстваў падзення спадарожніка на тэрыторыю краіны».

Калі ў міністра пацікавіліся, ці плануецца ў Беларусі пераход на кантрактную службу, ён заявіў, што спосаб камплектавання Узброеных Сілаў — унутраная справа дзяржавы. «Нейкія краіны пераходзяць на кантрактную службу, — кажа міністр, — але мы не збіраемся адмаўляцца ад тэрміновай службы. Толькі плануем скараціць тэрмін вайсковай службы з паўтара года да года (сёння 1,5 года служаць асобы без вышэйшай адукацыі, год — з вышэйшай. — **Аўт.**). Што ж датычыцца кантрактнікаў, то ў асноўным гэта спецыяльнасці, якім Узброеныя Сілы не рыхтуюць (напрыклад, вадзіцель, повар), ці больш складаныя спецыяльнасці, па якіх нельга навучыць за 1,5 года».

Гэтымі днямі, калі Узброеныя Сілы святкуюць свой 90-гадовы юбілей, варта ўзгадаць аб тым, чым сёння могуць ганарыцца беларусы. Створана ўласная сістэма ваеннай адукацыі (у час СССР у нас было толькі зенітна-ракетнае вучылішча). Беларускія ваенныя таксама маюць магчымасць вучыцца за мяжой — у Расіі, Германіі, Кітаі, Катары і г. д. У нашай краіне наладжана сістэма падрыхтоўкі лётчыкаў, прычым выкарыстанне трэнажораў дазваляе не толькі эканоміць паліва, але і не рызыкаваць чалавечым жыццём у адпрацоўцы паводзінаў у экстрэмальных умовах. Беларускія лётчыкі ўстанавілі шэраг сусветных рэкордаў, у якасці запасных аэрадромаў выкарысталі ўчасткі аўтадарог. На сёння каэфіцыент злачыннасці ў беларускай арміі знізіўся з 10,9 у 1994 годзе да 4,2 (колькасць злачынстваў на 1000 чалавек). Воінскі абавязак стаў па-сапраўднаму ганаровым, бо ў нашай краіне не прызываюць грамадзян, якія былі асуджаныя. Міністэрства абароны Беларусі значна пашырыла спектр адтэрміновак ад вайсковай службы, прадаставіўшы юнакам магчымасць працягнуць адукацыю. З нагоды 90-годдзя Узброеных Сілаў створаны фільм аб нашай арміі «Шчыт Айчыны». Неўзабаве з'явіцца першае ваеннае інфармацыйнае агенцтва.

**Ірына ПРЫМАК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Радавы Узброеных Сілаў Беларусі Ігар ШНАРСКІ прызываўся са старажытнага Мсціслава, і хоць служыць юнаку давялося ў сталічным гарнізоне, сябры-землякі не забываюць наведваць свайго салдата.**

## Рабочы візіт

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 21 лютага накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю для ўдзелу ў нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц СНД.

Нефармальная сустрэча лідараў краін СНД пройдзе ў Маскве 22 лютага. Як чакаецца, прэзідэнты абмяняюцца думкамі па актуальных пытаннях далейшага супрацоўніцтва ў рамках Садружнасці.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Сержа Саркісяна з перамогай на выбарах прэзідэнта Арменіі

«Упэўнены, што Ваш вопыт і высокі прафесіяналізм будуць садзейнічаць паспяховай дзейнасці на вышэйшай дзяржаўнай пасадзе па забеспячэнні ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Арменіі, умацаванню аўтарытэту краіны на міжнароднай арэне», — адзначаецца ў пасланні. Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў высокі ўзровень узаемаразумення і даверу паміж дзвюма дзяржавамі, актыўны характар двухбаковага супрацоўніцтва, якое будзе і ў далейшым развівацца і ўмацоўвацца ў духу канструктыўнага, узаемавыгаднага партнёрства.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НА ВЫХАДНЫЯ АПАДКІ І ВЕЦЕР, У СУБОТУ МЕСЦАМІ ДА 23 М/С, І ЎСЁ Ж — ВЯСНА!

**У Дзень абаронцаў Айчыны да нас завітае актыўны цыклон з боку Скандынавіі, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Таму ў суботу часам будзе ісці дождж. Чакаецца ўзмацненне ветру з парывамі да 15—20 м/с, а месцамі — да 23 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак — 1—7 градусаў цяпла. У нядзелю надвор'е крыху палепшыцца. Невялікія ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу чакаюцца толькі месцамі. Раніцай і ўдзень слабы туман і галалёд. Уначы парывы ветру па паўночным усходзе да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — ад 0 да 6 цяпла. У пачатку наступнага тыдня ўсталюецца веснавы характар надвор'я. Месцамі пройдзе дождж. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 1 градуса да плюс 4 цяпла, удзень 1—8 цяпла, у панядзелак па поўдні да плюс 10 градусаў. Спецыялісты гідраметцэнтра разлічваюць, што ў апошні тыдзень лютага і ў першай дэкадзе сакавіка пачнецца сапраўдная вясна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### САБАКА НАКІНУЎСЯ НА ДЗЯЦЕЙ...

**У Гомелі трое дзяцей пацярпелі ад укусаў сабакі — мешанца дварняка з аўчаркай — і былі дастаўлены ў бальніцу.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, здарэнне адбылося каля трох гадзін дня ў раёне навабудоўлі, у двары аднаго з дамоў па вуліцы Мазурава. Паводле папярэдняй інфармацыі, бяздомны сабака напаў на малых пасля таго, як яго зачапіў мужчына, што знаходзіўся нападпітку: ён, як здалося сведкам здарэння, штурхнуў нагой жывёліну. Раззлаваны «шарык» вымесціў шалёную злосць на дзецях ва ўзросце да 10 гадоў, якія гулялі побач. Аднаму з пацярпелых дасталося больш за ўсіх — сабака зачапіў сухажыллі на руцэ. Супрацоўнікам МНС і міліцыі не ўдалося адразу вылавіць жывёлу, каб праверыць яе на шаленства.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ДЗІЦЯ ЗАГІНУЛА НА ПАЖАРЫ

**У вёсцы Старыя Дваранінавічы Кіраўскага раёна загінула 13-гадовая дзяўчынка.**

Прэс-служба Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС паведаміла, што пажар адбыўся 20 лютага ўдзень. У хаце знаходзілася 92-гадовая бабуля і дзве яе праўнучкі: 4-гадовая Вераніка і 13-гадовая Насця. Старая гатавала на кухні ежу і, калі адчула пах дыму і адчыніла дзверы ў пакой, не змагла нічога разгледзець у дыме.

Тым часам падбег сусед, які ўбачыў, як ідзе дым з вокнаў. 41-гадовы работнік мясцовага СВК «Чырвоны баец» выцягнуў з хаты бабулю і малодшую дзяўчынку, якую знайшоў пад ложкам. А вось выратаваць Насцю не атрымалася з-за моцнага задымлення. Дзяўчынка загінула. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай пажару магло стаць дзіцячае свавольства з агнём. Але расследаванне яшчэ не завершана. Сёлета гэта першы выпадак гібелі дзіцяці на пажары ў Магілёўскай вобласці. Летась на пажары загінула адно дзіця.

**Ілона ІВАНОВА.**

### САЛДАТ «НАПРАКАТ»

**Камандзір адной з часцей Бабруйскага гарнізона замест таго, каб вучыць падначаленых салдатаў вайсковай справе, здаваў іх у арэнду камерсантам.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генеральнай пракуратуры, маёр па просьбе свайго знаёмага накіроўваў у яго распараджэнне вайскоўцаў для пагрузкі будаўнічых матэрыялаў. За танную рабсілу афіцэр атрымаў ад удзячнага бізнэсмена «ганарар» у памеры 100 тысяч рублёў. І гэта быў не адзінкавы выпадак, калі камандзір часці салдацкімі рукамі паляпшаў свой дабрабыт. Як высветліла пракуратура, камандзір таксама «пазычаў» сваіх падначаленых адной фірме для пагрузкі і разгрузкі садавіны.

За злоўжыванне ўладай Бабруйскі міжгарнізонны суд прыгаварыў маёра да 3 месяцаў арышту. Нядобрасумленны афіцэр таксама звольнены з Узброеных Сілаў Беларусі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# НА ПАТОКУ — ШПРЫЦЫ

**Адным з прадпрыемстваў, якія ў Гомелі наведаў прэм'ер-міністр краіны Сяргей Сідорскі, было адкрытае акцыянернае таварыства «Медпласт». Пасля завяршэння мантажу абсталявання ўчора адбыўся пуск другога комплексу вытворчасці шпрыцаў аб'ёмам 10 і 12 мілілітраў.**

— Да гэтага важнага моманту, — сказаў Сяргей Сідорскі, — мы тры гады ішлі, выконваючы даручэнне Прэзідэнта краіны цалкам забяспечыць нашы айчынныя патрэбнасці ў аднаразовых медыцынскіх шпрыцах.

Да гэтага Беларусь закупляла іх за мяжой і плаціла валютай. Патрэбнасці нашай краіны — 180 мільёнаў шпрыцаў у год. Праектная ж магутнасць суперновага нямецкага абсталявання, якое паставіла фірма NRANSCIECT, — 190 мільёнаў. Прадукцыя ААТ «Медпласт» — канкурэнтаздольная як па якасці, так і па цане, і тыя дадатковыя 10 млн шпрыцаў будуць экспартавацца.

Іголкі для шпрыцаў, сказаў кіраўнік урада, якія ў іх сабекошце складаюць 17 працэнтаў, краіна закупляе ў Японіі, і ёсць неабходнасць падумаць, ці варта нам будаваць завод па выпуску іх, бо практыка паказвае, што прыбытак ад яго дзейнасці можна атрымаць пры вырабе іх 2 млрд у год.

Сяргей Сідорскі адзначыў, што яшчэ гады чатыры таму ААТ «Медпласт» было стратным прадпрыемствам. Сёння ў яго мадэрнізацыю ўкладзены вялікія грошы, а сярэдняя заработная плата ў калектыве дасягнула 450—500 тысяч рублёў. Таму задача перад новым кіраўніцтвам таварыства — падвоіць выпуск прадукцыі, пашырыць экспартны патэнцыял і павысіць заработную плату да 1 млн рублёў.

Цана на газ для Беларусі ў 2008 годзе павышацца не будзе, — сказаў прэм'ер-міністр. «У адпаведнасці з дамоўленасцю на працягу 2007 года цана на газ была на ўзроўні $100 за 1000 кубаметраў, з гэтага года дабавілі 19 працэнтаў, і ў нас ёсць упэўненасць, што да канца года цана павышацца не будзе».

Кіраўнік урада наведаў таксама ААТ «Гомельшкло», дзе ў пачатку наступнага года з'явіцца новае абсталяванне па вырабе паліраванага шкла, пацікавіўся станам спраў у жывёлагадоўчай галіне вобласці з прыцэлам на будаўніцтва новых сучасных фермаў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Магчымасць паляпшэння пенсійнага забеспячэння дырэктараў прадпрыемстваў прапрацоўваецца ў Беларусі

Аб гэтым заявіў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка на гадавым сходзе Рэспубліканскай асацыяцыі прадпрыемстваў прамысловасці. Ён падтрымаў прапановы прамыслоўцаў па абароне правоў кіраўнікоў прадпрыемстваў пасля спынення імі працоўнай дзейнасці, а таксама па паляпшэнні іх пенсійнага забеспячэння.

«Сёння праблема падабраць добрага дырэктара, а стымулаў у іх пакуль што менш, чым абавязкаў», — дадаў першы віцэ-прэм'ер.

Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, ён дакладваў аб гэтай праблеме Прэзідэнту краіны і сустрэў разуменне з боку кіраўніка дзяржавы. «Таму нам трэба падумаць аб пенсійным забеспячэнні, спачатку, хоць бы тых кіраўнікоў, якія ўваходзяць у кадравы рэестр Прэзідэнта», — лічыць ён. Размова ідзе аб кіраўніках буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў, такіх як МТЗ, МАЗ, «Нафтан».

**БЕЛТА.**

Аўтарытэтна

# ПРАВА ПЕРШАЧАРГОВАГА РАЗМЕРКАВАННЯ ПРАДАСТАЎЛЯЕЦЦА...

**Устанаўленне фінансавай адказнасці за ўхіленне ад працы паводле размеркавання павысіла адказнасць учарашніх выпускнікоў — такой думкі прытрымліваюцца ў галоўным адукацыйным ведамстве нашай краіны. Паводле інфармацыі Міністэрства адукацыі, летась прыступілі да працы па месцы свайго размеркавання 95 працэнтаў выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў і 90,5 працэнта размеркаваных выпускнікоў ССНУ. Некаторыя выпускнікі «прагінравалі» размеркаванне вымушана, толькі па той прычыне, што вырашылі прадоўжыць навучанне або ў магістратуры (выпускнікі ВНУ), або ў вышэйшай навучальнай установе (выпускнікі ССНУ).**

**Трэба заўважыць, што стаўленне да размеркавання апошнім часам змянілася. Тыя маладыя людзі, якія яшчэ на старшых курсах знайшлі сабе месца будучай працы, ставяцца да размеркавання рэзка адмоўна, бо «свяшчэнны абавязак», які яны абавязаны вярнуць дзяржаве, можа паблытаць усе іх жыццёвыя планы. Многіх маладых людзей зусім не радуе перспектыва быць размеркаванымі «ў правінцыю» ці на дзяржаўнае прадпрыемства з мізэрнай заработнай платай. Між іншым, далёка не ўсе выпускнікі могуць самастойна прадуладкавацца па сваёй спецыяльнасці. А размеркаванне якраз гарантуе ім прадастаўленне першага працоўнага месца. Невыпадкова інтарэс да размеркавання праяўляюць ужо і так званыя «платнікі». Летась на ўласным жаданні былі размеркаваныя 12,5 працэнта выпускнікоў ВНУ і каля 10 працэнтаў выпускнікоў ССНУ, якія навучаліся з уласных сродкаў — яны былі накіраваны па заяўках арганізацый, што засталіся незадаволенымі пасля размеркавання выпускнікоў-бюджэтнікаў.**

**Між іншым, у снежні мінулага года пастановай урада была зацверджана новая рэдакцыя Палажэння аб размеркаванні выпускнікоў. Аб тым, наколькі істотна змяніліся «правілы гульні», — наша гутарка са старшынёй Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, і намеснікам старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раманам ДАПІРАМ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Нам прыемна канстатаваць, што практычна ўсе нашы прапановы па ўдасканаленні парадку размеркавання выпускнікоў знайшлі адлюстраванне ў новым Палажэнні. У дакуменце ўтрымліваецца шмат ліберальных пазіцый у дачыненні да выпускнікоў. Так, напрыклад, у новым Палажэнні больш дакладна і падрабязна прапісаны механізм пераразмеркавання. Да таго ж значна пашыраны пералік падстаў для пераразмеркавання. «Узаконеныя», нарэшце, і персанальныя заяўкі. Раней увогуле адсутнічалі нормы, якія рэгулявалі б так званыя імянныя ці персанальныя заяўкі. Але, не хачу хаваць, што мы ўжо бачым некалькі праблемных момантаў, якія могуць узнікаць у працэсе размеркавання.

У гэтым годзе, як і раней, пры вызначэнні чарговасці будуць брацца пад увагу паспяховасць студэнта ў вучобе і яго ўдзел у навукова-даследчай і грамадскай рабоце. Але права першачарговага размеркавання будзе прадастаўляцца выпускнікам, якія з'яўляюцца лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы здольных навучэнцаў і студэнтаў і фонду па падтрымцы таленавітай моладзі. Выпускнікі, якія размяркоўваюцца ў ліку першых, безумоўна, маюць перавагу перад астатнімі ў выбары будучага месца працы. Тэарэтычна колькасць заявак, з якіх яны могуць выбіраць, у іх намнога большая. Аднак у новым Палажэнні з'явілася норма, якая прадугледжвае, што ў першую чаргу выпускнікі будуць размяркоўвацца ў дзяржаўныя арганізацыі і арганізацыі з дзяржаўнай доляй уласнасці, згодна з заяўкамі на спецыялістаў з гэтых арганізацый. І толькі па меры задавальнення патрэбаў у спецыялістах дзяржаўных арганізацый будзе магчымае размеркаванне выпускнікоў у іншыя арганізацыі, а таксама разгляд заявак арганізацый аб размеркаванні да іх на работу канкрэтных выпускнікоў. На практыцы гэта азначае, што нават калі студэнт-выдатнік прынясе персанальную заяўку на размеркаванне яго ў пэўную арганізацыю, яе могуць і не ўлічыць. І не мае ніякага значэння, што ён знаходзіцца наперадзе рэйтынгу, добра сябе зарэкамендаваў падчас праходжання вытворчай практыкі на нейкім прадпрыемстве ці ў арганізацыі прыватнай формы ўласнасці. Камісія па размеркаванні абавязана будзе ў першую чаргу закрываць усе заяўкі, якія паступілі ў навучальную ўстанову ад дзяржаўных арганізацый. На наш погляд, рэалізацыя гэтай нормы створыць шэраг не вельмі прыемных прэцэдэнтаў.

*(Заканчэнне на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Выпрабавана на сабе

# СЯБРЫ, СВАЯКІ, СУСЕДЗІ І ПАЎКІЛО ЎСПАМІНАЎ

## *Хто «расстаўляе сеткі» ў Інтэрнэце?*

**Ат, не ведаў герой вядомай песні, як з найменшымі выдаткамі часу і сілаў адшукаць сваю каханую. У ясеня спытаў, у таполі... Трэба было спытаць у пошукавай сістэмы «Яндэкс». Або адразу, не марудзячы, зарэгістравацца на «Аднакласніках.Ру».**

**Зрэшты, на момант выхаду ў кінапракат першай «Іроніі лёсу» (1975 год) падобных сэрвісаў проста не існавала. І справа нават не толькі ў імклівым развіцці сучасных Інтэрнэт-тэхналогій, доступ да якіх тады мелі лічаныя адзінкі, а сёння — і піянеры, і пенсіянеры. На той час і да ўзнікнення тэлепраграмы «Чакай мяне» было яшчэ далёка — амаль 25 гадоў. І не тое нават каб у мінулым тысячагоддзі людзі не разыходзіліся па жыцці, а потым не спрабавалі шукаць адно аднаго — і губляліся, і знаходзіліся, усё ж дзве сусветныя вайны, адну рэвалюцыю і распад звышдзяржавы перажылі. Але такі масавы характар памкненне «знайсці і пералічыць па галовах» набыло ўсяго пару гадоў таму. І пайшлі, як грыбы, расці сацыяльныя сеткі — рэсурсы, з дапамогай якіх людзі з розных краін і кантынентаў аднаўляюць страчаныя і завязваюць новыя кантакты.**

### Даведка

*Тэрмін «сацыяльная сетка» быў уведзены ў 1954 годзе сацыёлагамі. Ён развіваў падыход да даследавання сацыяльных сувязяў паміж людзьмі з дапамогай так званых сацыяграм — дыяграм, у якіх асобныя персоны прадстаўленыя ў выглядзе кропак, а сувязі паміж імі — у выглядзе ліній. У інтэрнэце першыя веб-сайты сацыяльных сетак з'явіліся ў 1995 годзе. Напрыклад, з гэтага моманту бярэ адлік сайт Classmates.com («аднакласнікі»), які дапамагаў карыстальнікам знаходзіць і падтрымліваць сувязь з тымі, з кім чалавек меў справу на працягу ўсяго жыцця, ад дзіцячага садка да ВНУ, вайсковай службы і месца работы. Гэтая сетка існуе і цяпер, налічваючы больш як 40 мільёнаў актыўных карыстальнікаў, пераважна з ЗША і Канады. Але безумоўным лідарам у сусветным павуцінні па ахопе аўдыторыі на дадзены момант з'яўляецца рэсурс MySpase.com, які аб'ядноўвае каля 80 мільёнаў карыстальнікаў.*




*...Вам знаёмае адчуванне «выпасці з жыцця»? Прыкладна так сябе адчуваеш у незнаёмай кампаніі, якая размаўляе пра нешта сваё, аб чым ты не маеш уяўлення, або ў месцы, дзе быў толькі аднойчы ў глыбокім дзяцінстве, а ў сучаснасці сустрэў зусім іншы пейзаж і антураж. Ці не кожны другі расказвае: «Вось, адшукаў праз «Аднакласнікаў» былога саслужыўца». Іншыя скардзяцца, што кіраўніцтва забараніла доступ да гэтага рэсурсу. У стужках навінаў там і тут паведамленні — дзе пра скандалы, звязаныя з «ліпавымі» «Аднакласнікамі», дзе пра зорак шоў-бізнэсу, спорту, палітыкі, якія не баяцца выходзіць у сацыяльную сетку і кантактаваць са знаёмымі, якія ведалі гэтых зорак яшчэ да ўзыходжання на Алімп. Я цікаўлюся ў знаёмых, навошта ім гэтыя сеткі, больш падобныя да секты — а мне слушна пярэчаць, што пра густ апельсінаў варта спрачацца толькі з тымі, хто іх еў. У рэшце рэшт, хутчэй, з жадання адзін раз убачыць, чым з памкнення сапраўды кагосьці знайсці, вырашаю нырнуць у сетку.*

**(Заканчэнне на 7-й стар.)**

ISSN 1990 - 763X

## КУРСЫ ВАЛЮТ

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.02.2008 г. (для б/н разлікаў) | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 3 164,25 |
| 1 латвійскі лат | 4 545,36 |
| 1 літоўскі літ | 916,42 |
| 1 чэшская крона | 125,45 |
| 1 польскі злоты | 884,49 |
| 1 расійскі рубель | 87,53 |
| 1 украінская грыўня | 427,48 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў. Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 24,5299 |
| 10 UAH | 48,1923 |
| 1000 BYR | 11,4172 |
| EUR | 36,1399 |
| Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.02.2008 г.) | |
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.
ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

белагропромбанк
традиции будущего
ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2007»

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»
СООБЩАЕТ, ЧТО 28 МАРТА 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2007 год и задачах на 2008 год.
2. О заключении Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк» по годовому отчету банка за 2007 год.
3. Об утверждении годового отчета ОАО «Белагропромбанк» за 2007 год.
4. О распределении прибыли банка за 2007 год.
5. О выборах нового состава Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».
6. О выборах нового состава Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания — 15.00.
Место проведения собрания: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев акций, сформированного по состоянию на 20 февраля 2008 г.
Лица, имеющие право на участие в общем собрании, могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по адресу: г. Минск, проспект Жукова, 3, начиная с 24 марта 2008 г. с 10.00 до 16.00.
Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании, будет проводиться 28 марта т.г. с 12.30 до 14.45 при предъявлении документов, подтверждающих их полномочия.
Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 218 56 12.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2, УНП 100693551

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ
ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует,
ЧТО С 25 ФЕВРАЛЯ 2008 ГОДА ИЗМЕНЯЮТСЯ ПРОЦЕНТНЫЕ СТАВКИ ПО НЕКОТОРЫМ ВНОВЬ ВЫДАВАЕМЫМ КРЕДИТАМ ФИЗИЧЕСКИМ ЛИЦАМ НА ПОТРЕБИТЕЛЬСКИЕ НУЖДЫ
*Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте банка*
www.belarusbank.by
*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион
по продаже комплекса зданий, расположенных по адресу: г. Гродно, станция Аульс, в том числе: котельной (общ. пл. 182,4 кв.м), двух битумохранилищ (общ. пл. 512,8 и 165,4 кв.м), мазутохранилища (общ. пл. 286 кв.м). Площадь земельного участка 0,7582 га. Начальная цена (снижена на 20 %) — 143 786 628 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.12.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 04 марта 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03 марта 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.
Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в Интернете: www.rlt.by
КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

## ПРЕСС-СЛУЖБА «НАЦИОНАЛЬНЫХ СПОРТИВНЫХ ЛОТЕРЕЙ»

# СЕКРЕТЫ УСПЕХА «СУПЕРЛОТО»

***27 февраля 2008 года исполняется ТРИ ГОДА с момента выхода в эфир первого тиража лотереи «СУПЕРЛОТО». За три года существования игры состоялось 156 тиражей, тысячи игроков стали победителями и получили замечательные призы!***

***Лотерея «СУПЕРЛОТО» получила признание народа и сегодня стала настолько популярной, что в праздничные тиражи в ней принимает участие практически каждый седьмой житель Республики Беларусь.***

***29 реальных квартир в Минске, 340 элитных автомобилей, десяток килограммов золота Национального банка, несколько сотен изысканных ювелирных украшений, выигрыши на общую сумму 163 млрд 59 млн 641 тысяча рублей — все эти призы уже получили игроки «СУПЕРЛОТО» в обмен на счастливые лотерейные билеты.***

***Накануне праздничного 157-го тиража «СУПЕРЛОТО», посвященного ТРЕХЛЕТИЮ лотереи, мы встретились с начальником рекламно-информационного отдела Республиканского унитарного предприятия «Национальные спортивные лотереи», ведущей лотереи «СУПЕРЛОТО» Олесей РЯБУХИНОЙ.***

**— Олеся, в чем, на ваш взгляд, заключается главный секрет успеха лотереи «СУПЕРЛОТО»?**

— Факторов, влияющих на популярность и поразительный успех лотереи «СУПЕРЛОТО», в действительности очень много. С самого начала деятельности нашего предприятия самой главной целью для нас было завоевание доверия белорусского народа. Сегодня, когда основные шаги по достижению этой цели уже сделаны, мы очень ценим и искренне дорожим этим доверием. Именно поэтому основными постулатами, которыми мы руководствуемся при подготовке к каждому тиражу «СУПЕРЛОТО», являются честность и открытость.

Розыгрыш призов лотереи «СУПЕРЛОТО» максимально прозрачен: тираж проходит в прямом эфире, здесь же называются номера выигрышных билетов, в еженедельных сюжетах рассказывается о вручении призов победителям, о проведенных благотворительных акциях. Уже через два часа после эфира на сайте лотереи «СУПЕРЛОТО» (www.superloto.by) можно проверить билет, на второй день после розыгрыша в газетах «Антенна» и «Советская Белоруссия» печатаются протоколы розыгрыша.

Немаловажное значение в деятельности нашего предприятия имеет выбранная рекламная стратегия: здесь главенствуют те же принципы — правдивость, открытость и реальность. В рекламных роликах «СУПЕРЛОТО» зритель никогда не увидит преувеличенного или неправдоподобно приукрашенного изображения призов: мы показываем только реально разыгрываемые квартиры, автомобили, золотые слитки и т.п. Мы стараемся удивить и привлечь внимание наших игроков реальным обилием и значимостью призов, а не гнаться за обманчивым блеском. Если в «СУПЕРЛОТО» разыгрывается квартира, то в рекламе мы показываем именно эту реальную квартиру, а не снимок из какого-нибудь журнала. Если в качестве приза выставляются золотые слитки, то мы снимаем на камеру реальные слитки с индивидуальными номерами. А затем эти реальные призы вручаем реальным победителям. Игроки «СУПЕРЛОТО» это знают, вот почему доверяют нам. И именно поэтому на сегодняшний день «СУПЕРЛОТО» является лидером среди самых популярных лотерей не только Беларуси, но и стран СНГ.



**— Благотворительная деятельность «Национальных спортивных лотерей» очень обширна и затрагивает различные слои общества. Расскажите подробнее о благотворительных акциях «СУПЕРЛОТО».**

— Республиканское унитарное предприятие «Национальные спортивные лотереи» стало первым государственным предприятием, осуществляющим благотворительную деятельность в еженедельном режиме на постоянной основе. Вот уже третий год в школы Беларуси нашими представителями доставляется спортивный инвентарь на сумму 3 млн рублей в рамках акции «Суперлото — детям». В конце февраля этого года свой двухлетний юбилей отметит акция «Гарнизон», в рамках которой творческая группа «СУПЕРЛОТО» уже посетила с зажигательными концертами и подарками более сотни войсковых частей по всей нашей республике. Особую популярность в прошлом году приобрела замечательная акция «Надежда-2007», приуроченная к Году ребенка. В рамках этой социальнозначимой акции почти тысяча белорусских семей получила денежное вознаграждение за рождение ребенка на общую сумму около 500 млн белорусских рублей.

Лотерея «СУПЕРЛОТО» — инициатор проведения многочисленных благотворительных акций для детей-сирот и детей-инвалидов, правоохранительных органов, пенсионеров, ветеранов, спортсменов, олимпийских чемпионов и т.д. На сегодняшний день ни одно предприятие в Республике Беларусь не оказывает такую мощную социальную поддержку населения. Нам очень приятно, что другие организации по примеру нашей лотереи также стали оказывать помощь детям, предлагать свою поддержку при проведении различных благотворительных акций. Для нас очень важно, что «СУПЕРЛОТО» в этом плане является примером для подражания.

Мы очень рады, что победители «СУПЕРЛОТО» — это люди с открытыми сердцами и добрыми душами. Обладатели крупных выигрышей делятся своими выигрышами и победой с теми, кому в жизни повезло чуть меньше, кто нуждается в поддержке и помощи. С такими игроками, способными сочувствовать и сострадать, надеяться и верить, играть и выигрывать, мы без сомнения достигнем лучших результатов.

**— Судя по названию предприятия — «Национальные спортивные лотереи» — оно создано с целью поддержки и развития спорта и здорового образа жизни в нашей стране. Что уже сделано и что планируется сделать в рамках развития отечественного спорта?**

— Учредителем лотереи «СУПЕРЛОТО» является Министерство спорта и туризма Республики Беларусь. Всего за все время существования игры на развитие белорусского спорта было перечислено более 70 млрд рублей. Не подлежат никакому сравнению поступления денежных средств от лотерейной деятельности в бюджет нашей страны в 2004 году (до существования «СУПЕРЛОТО») и сейчас. «СУПЕРЛОТО» дало мощный толчок развитию лотерейной деятельности в Республике Беларусь, реально увеличило доходы в бюджет от лотерейной деятельности.

С самого начала деятельности предприятия проводятся благотворительные акции по поддержке и развитию спорта среди школьников и молодежи. Мы стараемся не забывать о тех людях, которые в свое время были кумирами миллионов, завоевали высшие награды во всевозможных спортивных состязаниях и соревнованиях. Так, в рамках акции «СУПЕРЛОТО — олимпийским чемпионам» почетными медалями, памятными часами и золотыми слитками награждались выдающиеся белорусские спортсмены.

Совсем недавно организаторам «СУПЕРЛОТО» было вручено свидетельство «Партнера Национального олимпийского комитета Республики Беларусь» за активную финансовую поддержку при подготовке к Олимпийским играм в Пекине. Каждый игрок лотереи может считать себя причастным к победам наших спортсменов на всевозможных соревнованиях, ведь часть средств от проведения каждого тиража лотереи «СУПЕРЛОТО» перечисляется именно на развитие спорта в Республике Беларусь.

**— Немаловажным фактором для игроков при выборе лотереи является гарантия достоверности проведения розыгрыша и обеспечение защиты от сбоев и ошибок. Что является гарантом честности и правильности проведения «СУПЕРЛОТО»?**

— Каждый тираж лотереи «СУПЕРЛОТО» проходит под наблюдением контролирующих органов. Именно лотерея «СУПЕРЛОТО» стала инициатором проведения проверки баз данных каждого тиража в Государственном центре безопасности информации при Президенте Республики Беларусь (ГЦБИ) до и после проведения розыгрыша для сравнения. Это исключает какие-либо недопустимые вмешательства со стороны организатора лотереи. Важным фактором является то, что программное обеспечение «СУПЕРЛОТО» сертифицировано, поэтому исключено возникновение сбоев и ошибок при проведении розыгрыша. По каждому тиражу «СУПЕРЛОТО» выдается экспертная оценка. За проведенные 156 тиражей лотереи «СУПЕРЛОТО» ГЦБИ не зафиксировал ни единого нарушения в ходе контрольных проверок.

**— Расскажите о коллективе «СУПЕРЛОТО», как налажена работа предприятия и скольких усилий это стоило?**

— Для того чтобы осуществлять такую сложную и специфическую деятельность, выполнять все на самом высоком уровне требуется очень тщательная организация, планирование и прогнозирование деятельности предприятия. Немалую роль играет сплоченный высокопрофессиональный коллектив, способный в любых условиях действовать как хорошо отлаженный четкий механизм. В штате «Национальных спортивных лотерей» работает более сотни человек, более тысячи человек работает по договору подряда — это распространители лотерейных билетов. Управлять таким большим количеством людей довольно сложно, это требует больших усилий. Однако работа налажена, процесс подготовки к каждому тиражу проходит по четкой отрегулированной схеме. А каждый сотрудник знает свои функции и четко их выполняет. Работники нашего предприятия знают, как престижно работать в «СУПЕРЛОТО» и стараются внести свой вклад в развитие нашей организации.

**— Какова же основная цель существования «СУПЕРЛОТО»?**

— Разумеется, приносить людям счастье, дарить радость, надежду и веру в то, что в один миг жизнь может измениться к лучшему, заиграть всеми яркими красками радуги. Наши победители приезжают к нам со всей Беларуси, а это значит, что даже в самых отдаленных уголках нашей страны каждое воскресенье ждут прямой эфир «СУПЕРЛОТО». Для нас самая большая радость — видеть счастливые, искренние улыбки на лицах победителей и их сияющие глаза.

Тысячи людей не побоялись испытать удачу: одни выиграли благодаря упорству и настойчивости, другие — благодаря счастливому случаю. Но, так или иначе, каждый победитель «СУПЕРЛОТО» может подтвердить: для того, чтобы выиграть, надо хотя бы приобрести билет. Иначе никак. Поэтому прислушивайтесь к внутреннему голосу, не бойтесь рисковать, дарите друг другу лотерейки. Ведь все, что сделано с любовью, приносит удачу!

**Объем реализации лотерейной продукции за 2007 год на 1 млн населения, шт**




**Объем реализации лотерейной продукции за 2007 год (в дол. США)**




УНП 190033145


## Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»

Настоящим извещаем о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров ОАО «Технобанк» в **очной форме**.

**Дата проведения: 26 марта 2008 года.**

**Место проведения (адрес): г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44, 11-й этаж, комната 1101.**

**Регистрация участников Общества для участия в собрании: с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.**

**Время проведения заседания: с 11.00 до 14.00.**

ПОВЕСТКА ДНЯ ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ:

1. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках и т.д. за 2007 год.
2. О распределении прибыли ОАО «Технобанк» за 2007 год.
3. О нормативах распределения прибыли ОАО «Технобанк» на 2008 год.
4. О выплате дивидендов за 2007 год.
5. Об участии ОАО «Технобанк» в юридических лицах.
6. Об утверждении локальных нормативных актов ОАО «Технобанк».
7. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
8. Об избрании членов Ревизионной комиссии ОАО «Технобанк».
9. Об избрании членов Совета Директоров ОАО «Технобанк».
10. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Технобанк».
11. О принятии решения о выпуске акций собственной эмиссии путем проведении открытой подписки на акции пятого выпуска ОАО «Технобанк».
12. О выкупе ОАО «Технобанк» акций собственного выпуска по требованию акционеров ОАО «Технобанк».

**Для регистрации с собой необходимо иметь: паспорт (для физических лиц), удостоверение руководителя и печать (для юридических лиц) либо иной документ, подтверждающий полномочия.**

*Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:*

**г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80**

*Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г. УНП 100706562*



## ОАО «Слуцкая фабрика пошива одежды» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

по продаже здания ателье № 5, об. пл. 155,0 кв.м, расположенное: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Площадь зем. участка 0,0595 га. Начальная цена — 80 000 000 бел. рублей с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 25.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 24.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224-61-34.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015


**50**

Віншуем з нагоды юбілею цудоўнага чалавека, таленавітага кіраўніка, клапатлівага сем'яніна **Антона Паўлавіча ДЗЕКЕВІЧА** з в. Мінойты Лідскага раёна. Зычым моцнага здароўя, шчасця, плённай працы, паспяховага асваення новых удачных узораў тэхнікі.

**Творчая брыгада «Звязды», калегі, сябры і родныя.**

ФАРМАТнём

## ЗАЗІРНУЦЬ У ДУШУ І ДЭКАЛЬТЭ

**З 21 па 24 лютага ў Мінску ў чарговы раз праходзіць эксклюзіўны паказ фільмаў у рамках праекта «КІНАфармат 4х4» у кінатэатрах «Аўрора», «Мір», «Перамога» і «Цэнтральны».**

Убачаць гледачы новую работу амерыканскіх кінематаграфістаў — драму **«Інтэрв'ю».** Аўтары сцэнарыя — Сціў Бушэмі, Тэадор Холман і Дэвід Шэхцер, рэжысёр-пастаноўшчык — Сціў Бушэмі.



Палітычнага рэпарцёра П'ера за нейкую правіннасць пасылаюць браць інтэрв'ю ў маладзенькай тэлезоркі Каці. Тая не ў гуморы, на сустрэчу спазняецца, яе «дасталі» прыхільнікі і журналісты, а тут яшчэ змрочны П'ер задае ідыёцкія пытанні і хаміць. Інтэрв'ю заканчваецца, ледзь пачаўшыся. Але на выхадзе з кафэ ў мітусні, якую выклікала з'яўленне зоркі, П'ер стукаецца лбом у шкло. Каця са спачуваннем цягне яго да сябе, каб прыкласці лёд, наклеіць пластыр. Вечар у абоіх безнадзейна сапсаваны, так што парачка закурвае, налівае і пачынае балбатаць пра тое-сёе...

Меладрама **«Поры года»** створана сумесна кінамайстрамі Турцыі і Францыі. Пастаноўку карціны па сваім сцэнарыі ажыццявіў Нуры Бельге Чэйлан.



...Чалавек створаны, каб быць шчаслівым па простых прычынах і быць няшчасным па яшчэ больш простых — гэтаксама як ён па простых прычынах быў народжаны і памірае па яшчэ больш простых... Іса і Бахар — два адзінокія чалавекі, якія перажываюць пастаянныя змены свайго душэўнага клімату ў пагоні за недасягальным шчасцем...

У галоўных ролях здымаліся Эбру Чэйлан, Нуры Бельге Чэйлан, Назан Кесал, Мехмет Эрылмаз.

Фільм удзельнічаў у Маскоўскім МКФ, а таксама ўдастоены прыза ФІПРЕССІ Канскага МКФ.

**«Паляванне Ханта»** — сумесная работа кінематаграфістаў ЗША, Харватыі і Босніі і Герцагавіны, пастаноўку якой ажыццявіў Рычард Шэпард.



Стаць аўтарам сенсацыйнага матэрыялу — шанц, які выпадае журналісту толькі раз у жыцці. Маючы на ўзбраенні толькі вельмі падазроную інфармацыю, тэлерэпарцёры накіроўваюцца ў небяспечнае і абсалютна непрадказальнае падарожжа...

У фільме здымаліся: Тэрэнс Ховард, Рычард Гір, Гардана Вукрэш, Джэймс Бролін, Санела Шэфараджыч.

У ЗША знята аўтабіяграфічная кінастужка **«Непрыстойная Бэці Пейдж».**



Порназорка Бэці Пейдж — рэальная жанчына, у красавіку мінулага года ёй споўнілася 84. Яна была знакамітай эратычнай фотамадэллю 50-х гадоў у Амерыцы. Яскравай, але прывычнай прыгажосці брунетка здзіўляла не столькі бездакорнымі формамі, колькі жыццярадаснасцю, якая біла праз край. І праз 50 гадоў Бэці Пейдж не перастала быць часткай поп-культуры: яна — персанаж коміксаў, песень і кніг, а зоркі шоў-бізнэсу (напрыклад, Дзіта фон Ціз) ладзяць па ёй свой сцэнічны вобраз.

Пастаноўку карціны паводле свайго сцэнарыя ажыццявіла рэжысёр Мэры Хэран. Фільм віртуозна зняты аператарам Мотам Хапфелам: пераважна чорна-белая карціна стварае атмасферу Нью-Йорка 50-х. Актрыса Грэтхен Мол перадала тую сумесь наіўнасці і ўпэўненасці ў сабе, якая мелася ў Пейдж і якая ўзбуджала мужчын.

**Раман КОСЦІН.**

## «РЫЦАРЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА»

**Так называецца выстаўка, якая праходзіць у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі.**

Выстаўка з'яўляецца супольным праектам музея, ваенна-гістарычнага клуба «Княжы Гуф» і грамадскага аб'яднання «Рыцары Вялікага Княства».

Экспанаты, прадстаўленыя на выстаўцы — касцюмы, даспехі, халодная і агнястрэльная зброя, катапульты, прадметы быту, — гэта ўсё ручная работа. Рэканструкцыя вышэйазначаных прадметаў XV—XIX стст. зроблена членамі клуба «Княжы Гуф»: Кацярынай Мікулёнак, Аленай Максімовіч, Вольгай Мяцельскай, Анатолем Паўлавым, Сяргеем Кавальчуком, Святланай Сікірыцкай, Юліяй Брузго.



Фота БЕЛТА.

Пры рэканструкцыі прадметаў, прадстаўленых на выстаўцы, аўтары абапіраліся на гістарычныя матэрыялы, жывапісныя палотны, гравюры, летапісы, манускрыпты і іншыя крыніцы. Рэканструяваныя членамі клуба рэчы рознага гістарычнага перыяду знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Выстаўка прадстаўляе агульныя рысы адзення, характэрныя для канкрэтнага перыяду, і дазваляе наведвальніку апынуцца ў мінулым, адчуць і ацаніць для сябе ўсе дэталі касцюма. Выстаўка працуе да 23 сакавіка.

**Наш кар.**


## ТЦ «КУПАЛОВСКИЙ»

*(г. Минск, ст. метро «Октябрьская», 2-й уровень)*

**СДАЕТ В АРЕНДУ ТОРГОВЫЕ ПЛОЩАДИ.**

***Конт. тел.: (8 017) 287 76 31, 287 77 14.***


Усміхнёмся!

**Дзве сяброўкі:**
**— Слухай, учора на вечарынцы так перабрала, што потым Лёша скарыстаўся маёй бездапаможнасцю!**
**— Што, дамагаўся?!**
**— Не, збег!**

☺

*Турнір лучнікаў па стральбе па яблыку адкладваецца з-за мярзотніка, які з'еў яблык. Аб'яўлены турнір лучнікаў па стральбе ў мярзотніка.*

☺

**— Сеня, што такое? Я чуў, што ты развёўся ўжо ў чацвёрты раз. Няўжо ўсе жанчыны такія пераборлівыя?**
**— Не... толькі мама.**

☺

*Раман Абрамовіч забыўся дастаць з кішэні партманет і выпадкова памыў бюджэт Нігерыі.*

☺



**Маленькі хлопчык прыносіць маме букет цудоўных кветак. Яна пытаецца:**
**— Ты дзе іх узяў?**
**— У цёткі ў ларку.**
**— А яна ведае?**
**— А як жа, яна за мной два прыпынкі гналася...**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.16 | 17.32 | 10.16 |
| Віцебск — | 7.08 | 17.19 | 10.11 |
| Магілёў — | 7.06 | 17.22 | 10.16 |
| Гомель — | 6.59 | 17.21 | 10.22 |
| Гродна — | 7.31 | 17.47 | 10.16 |
| Брэст — | 7.28 | 17.51 | 10.23 |

**Месяц**
***Поўня.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**
***Пр.*** *Васіля, Генадзя, Інакенція, Маркела, Нікіфара, Панкрата;* ***К.*** *Ізабэлы, Малгажаты, Марты, Пятра.*




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +5..+7°С | КІЕЎ +7..+9°С | РЫГА +3..+5°С |
| ВІЛЬНЮС +2..+4°С | МАСКВА +1..+3°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ 0..+2°С |

Дзве даты

## 22 лютага

**1732 год** — нарадзіўся Джордж Вашынгтон, адзін з «бацькоў-заснавальнікаў» ЗША, першы прэзідэнт Злучаных Штатаў (1789—1797).



**1651 год** — пачалася царкоўная рэформа патрыярха Нікана — комплекс богаслужэбна-кананічных мераў Рускай праваслаўнай царкве і Маскоўскай дзяржаве, накіраваных на змяненне існуючай тады ў Маскве абрадавай традыцыі з мэтай яе ўніфікацыі з тагачаснай грэчаскай. Выклікала раскол у Рускай царкве і пацягнула ўзнікненне шматлікіх стараверскіх плыняў.

Цытата дня:

***«Усё ў нашых руках, таму іх нельга апускаць».***

**Како Шанель (1883—1971), першая жанчына-мадэльер.**

## БЛАНДЗІНКІ СУПРАЦЬ!

У красавіку мінулага года ў Ніжнім Ноўгарадзе прайшла акцыя «Марш нязгодных бландзінак». Прысутныя (паводле крыніц ад 20 да 40 чалавек) пратэставалі супраць расхожага меркавання аб недалёкасці светлавалосых жанчын. Праўда, пазней арганізатары назвалі мерапрыемства правакацыяй.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 990. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12